Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

Раз'юшаныя, ярасныя парывы ветру шпурлялі ў акно сыпучыя, да болю ў вачах іскрыста-белыя крупінкі снегу. Ліне здавалася, што зіма, надакучлівая і цягавіта-нудная, ніколі не скончыцца. А як хацелася, каб сцюдзёна-белая навала як мага хутчэй згінула, адкінуўшы ад яе нечаканую самотнасць і неспакой. Душа жадала болей сонца, вясенняга капяжу з гарадскіх дахаў. Хацела, каб усё навокал радавалася такому нечаканаму і запаланіўшаму ўсе сутарэнні сэрца, усе куточкі душы і цела шчасцю. А як хацелася, каб усе ведалі пра яе, радаваліся разам з ёй, зайздросцілі нават, ухвалілі яе выбар... Каб не гэтая халаднеча, Ліна, здаецца, выбегла б з гэтага цьмянага, няўтульнага кабінета, дзе не лепшым чынам падабраны шпалеры — цёмна-зялёныя, у кветкі, на яе думку, абсалютная безгустоўнасць! — і што ёсць моцы закрычала б на ўвесь горад, бо ўсе ж, уяўлялася, мелі да гэтага дачыненне! — «Людзі, якая я шчаслівая!..» Мроіла аб сваім, хаця за дзень трэба было шмат зрабіць: перадаць усе дакументы (безліч папак, спраў, уліковых картак, журналаў), пры гэтым летуценна ўспамінаючы шчаснае, лагодна-пяшчотнае, што ўзлёсіла яе гэтак упершыню за некалькі апошніх, скупых на радасці і прыемнасці, гадоў жыцця ў гэтым невялічкім правінцыяльным гарадку.

Раённы цэнтр, у якім ужо восем гадоў працавала начальнікам пашпартна-візавай службы, яна раней вельмі любіла. Ліна была трыццацігадовая жанчына. Бялявая, з нябесным адлівам вачэй. Статная, невялічкага росту. Худая, бы дзяўчынка. Нейкая загадкавая і прыгожая. І гэтай сваёй загадкавасцю, незвычайнай прыгажосцю Ліна не аднаму мужчыну кідалася ў вочы, хоць характарам была залішне строгая, патрабавальная і абавязковая да ўсяго і ва ўсім, што з ёй было звязана і што акаляла вакол — да заляцанняў, працы, да выхавання васьмігадовага сына,— і ад гэтага мела нязначныя, але ўсё ж — яна жанчына! — непрыемнасці-неўразуменні.

«Вось жа Бог пару звёў»,— думалася ёй доўгімі зімовымі вечарамі. Пасябравалі з Ігарам яшчэ студэнтамі. Абое сіроты, ён на чатыры гады старэйшы. Яе вырасціла цётка Алена, сястра памерлай у маладосці маці. А ён — хлопец з інтэрната. Сябравалі тры гады. Потым Ігар скончыў фізкультурны факультэт і вярнуўся ў гэты гарадок, дзе і рос. Хаця мог застацца і ў вялікім горадзе. Не схацеў — колькі ні прасіла. Але позна было нешта змяніць, бо кахалі адно аднаго. Калі яна скончыла юрфак, згулялі сціплае вяселле.

Усё тады было як у казцы — вырваўшыся са сталічнага шуму і тлуму, яна была проста зачаравана ціхім, раўнамерным, павольна спланаваным жыццём гарадка, які яшчэ дзесяткі тры гадоў назад нічым, мабыць, і не адрозніваўся ад звычайнай палескай вёскі. І тады гарадок, здавалася, сустрэў яе дужа ветліва. Яна адчувала яго дабрыню і тады, калі было цяжка, у дні самотнасці і невясёлых роздумаў. Тут прайшло спазнанне новага, тут нарадзіўся яе Віталька, тут знайшла, здавалася б, шчырых, сардэчных, надзейных сяброў. І гора... Здраду былых сяброў. Больш крыўдавала менавіта з-за гэтага, пакінутая сам-насам са сваёй бядой. З-за гэтай чорнай іх здрады яе жыццё з маленькім Віталькам апошнія гады ператварылася ў кашмарны сон — яе асуджалі невядома за што, а яна не магла зразумець: у чым і перад кім яна вінавата? І гарадок дзень за днём страчваў у яе вачах усялякую прывабнасць. Ранейшае зачараванае пачуццё да яго знікла раптоўна, як і не было яго ніколі...

Цяпер ёй часам хацелася знікнуць у людскім натоўпе, паблукаць па знаёмых здаўна мясцінах. У гэтыя хвіліны сапраўднага шчасця яна не хацела адчуваць сябе вінаватай ні перад кім, яна ўсім усё даравала, бо кахала, кахала так, што ўсё астатняе сплывала з думак некуды недасяжна далёка. Хацелася быць раскаванай, вольнай. Але мяцеліла за акном, ведала сваю карпатлівую справу зіма, міжволі далучаючыся да яе сённяшняй летуценнасці і... даносячы ўсё ж нейкае няўцямна-прыкрае адчуванне віны...

З раніцы дзень пасоўваўся звыкла і тлумна. У праёме дзвярэй кабінета змяняліся твары. Людзі з'яўляліся кожны са сваім клопатам: хто як найхутчэй уклеіць у пашпарт фотакартку ці наогул замяніць на новы, хто аформіць прапіску, а хто і выпісацца. Гарадок быў невялікі, Ліна ведала многіх у твар: не часта, але пашпартны стол людзям наведваць прыходзілася — мала што можа здарыцца ў жыцці.

Большага ж клопату патрабавалі вяскоўцы, якіх, бывала, і не паспявала ўсіх прыняць. Рэйсавыя аўтобусы ў далёкія вёскі хадзілі раз на тыдзень, таму і спяшаліся ў райцэнтр у такія дні і дзецюкі, і маладзіцы, і старыя людзі. Такімі днямі, жартуючы словамі сяржанта Сідаркова, якому выпадала найбольш такіх дзяжурстваў, проста «вушы млеюць» ад шумлівых наведвальнікаў, што ўздоўж шырокага калідора райаддзела міліцыі чакаюць сваёй чаргі да «пашпартнага начальніка». Яна ж, лейтэнант Ліна, толькі ўсміхалася на скаргі супрацоўнікаў: хоць, лайдакі, баек наслухаецеся... Тут жа і сапраўды чаго толькі ні пачуеш за дзень: і якая сёлета злосная зіма, яшчэ тая, даўняя, што ні дроў не набярэшся, ні кармоў жывёле і што цэны, каб на іх растакую, «кусаюцца» — «вочы на лоб пруць», а зарплату як далі яшчэ па восені, так і не бачылі больш...

І разам з тым Ліну радавала, што сёння яе апошні дзень службы ў райаддзеле...

Мінулай восенню, сталася так, яна не паспела нават пабачыць лістапад. У цёплыя, пагодлівыя дзянькі яна любіла з Віталькам гуляць у гарадскім парку, хадзіць, марыць, чытаць вершы. Віталька любіць слухаць... Калі ён быў маленькі, яны прыходзілі сюды і з Ігарам...

За шмат гадоў працы ў аддзеле міліцыі іх упершыню сабралі на перападрыхтоўку, ажно на месяц. Гэта быў іншы, не падобны да горада яе юнацтва, зусім незвычайны, паблiскваючы рэкламнымі шчытамі горад. Але гэта быў горад яе студэнцкіх гадоў. Крыгалевіч, начальнік міліцыі, прасіў завезці ў міністэрства некалькі важных папер. Ёй жа што — хіба цяжка? Аддала

куды трэба — і на заняткі. А на ганку спаткала яго, Генку, трыццацігадовага халасцяка, які за гэты месяц у Мінску проста прымусіў сябе пакахаць!

...Пранізлівы званок далучыў да рэальнасці — звычайна кожны дзень клікаў начальнік аддзела ўнутраных спраў Крыгалевіч.

Ліна ніколі не любіла і не паважала яго, гэтага таўставатага, чырвонашчокага начальніка, які валачыўся ледзь ці не за кожнай прывабнай жанчынай райцэнтра. Чапляўся начальнік колькі разоў і да яе. Толькі нічога з таго не выйшла. Даўняя аплявуха, якую яна дала Крыгалевічу з усяе сілы, астудзіла яго заляцанні да яе. Здавалася, назаўсёды.

...Начальнік міліцыі не звяртаў на Ліну ўвагі — працягваў дакладваць зводку здарэнняў абласному ўпраўленню. Ліна стаяла каля дзвярэй, крыху абыякавая да тых даных, якія назваў Крыгалевіч, але яны чапляліся, праходзілі праз яе свядомасць, западалі ў памяць.

«Бярэ верх крадзеж. За апошнія суткі — тры сур'ёзныя выпадкі. Абрабаваны магазін у Загацці, скрадзены аўтамабіль у райцэнтры, матацыкл у Рудні... Даярка калгаса «Змена» спрабавала вывезці з фермы дадому мех жытняй мукі, пяць літраў сырадою. Затрымаў участковы...»

Апошняе яе асабліва ўсхвалявала. Цяжка жывецца сёння вяскоўцам, калі і малако пачалі красці...

Кадушкаваты, сярэдняга росту, з залысінай маёр міліцыі Рыгор Ануфрыевіч Крыгалевіч не любіў такія негатыўныя зводкі. Чакай пасля іх ушчування, ды і каб чаго іншага не было. А як ціха — спяваць хочацца, хоць жа яму, як кажуць, мядзведзь на вуха наступіў — толькі і ўмее, што гарлапаніць. Ды і то, добра ведае Ліна, як у добрай кампаніі падап'е, а гожая, пекная дзяўчына ці маладзіца ласку да яго вялікую будзе мець.

Крыгалевіч ажно ўзапрэў — відаць, перапала на абаранкі і сёння. Ён выцер хусцінкай вялікі адкрыты лоб, падняў вочы на Ліну, хвіліну нешта думаў-успамінаў, нарэшце сказаў:

— Вось што, Ліна Паўлаўна. Па абедзе прыйдзе з бальнічнага Святлана, пашпартыстка, здайце пакуль ёй справы. Тут вось інструкцыі з міністэрства, забярыце. Так... І просьба ўласная будзе. Косціка ў Германію хачу адправіць, ужо і выклік прыйшоў. Усе тут дакументы. Аформіце апошні раз. Зрабіце ўжо ласку, ніколі для сябе не прасіў.

— Добра, таварыш маёр...— Ліна падышла да стала, узяла пасведчанне і фотаздымкі.— Можна ісці, таварыш маёр?

Яна старалася весці сябе падкрэслена афіцыйна з Крыгалевічам, успамінаючы той недарэчны выпадак з аплявухай і не жадаючы працягваць ніякіх уласных узаемаадносін з начальнікам міліцыі.

— Пачакайце, лейтэнант Лазіцкая...— Вочы Крыгалевіча расшырыліся, проста свідравалі маладую жанчыну.

Ёй стала аж няёмка ад гэтага цяжкога, працяглага позірку маёра. Сцялася, але ж вытрымала дапытліва-ацэньваючы позірк, чакала. Чым яшчэ хоча сёння здзівіць яе начальнік міліцыі — ніколі ж асабістых даручэнняў не даваў? Больш, калі была якая патрэба, яго жонка звярталася.

— Пачакайце... У мяне ёсць для вас навіна. Толькі... Вось не ведаю, ці яна вас парадуе.— Кожнае слова Крыгалевіч бы смакаваў, інтанацыйна выдзяляў.

— Нешта з пераводам у Мінск? — усхвалявана спыталася Ліна.

— Не, тут усё ў парадку. Але ведаю, што гэта не парадуе. А вы...

Ліне здалося, што час быццам бы запаволіўся, яна стамілася ад гэтай размовы-гульні ў кошкі-мышкі за ўсе гэтыя гады. Зразумела, што начальнік

нешта выкапаў, каб балюча параніць яе. Няўжо яшчэ на нешта спадзяецца? Хутчэй бы адсюль, ад гэтага пахатлівага — з'еў бы! — позірку ненажэрных вачэй...

— А вы папрыгажэлі, Ліна. Я, дарэчы, і не паспеў павіншаваць вас з вяселлем. Як кажуць — маладым шчасця, кахання. А навіна такога, значыцца, парадку. Ваш былы муж, Лазіцкі Ігар Пятровіч, датэрмінова вяртаецца з турмы, так сказаць, за прыкладныя паводзіны... Так, вось і паперкі на стале. Як жа гэта ў вас... атрымалася? Вы ж, здаецца, чакалі яго. Ха-ха, з-за вас жа загрымеў. А яшчэ кажуць — жаночая вернасць! Казка пра ваўка і семярых казлянят,— Крыгалевіч здзекліва ўсміхнуўся.— Як сёння помню, у гэтым кабінеце вы, Ліна Паўлаўна, прасілі ўмяшацца, дапамагчы. Любілі яго...

Спалоханая, збялелая, як палатно, Ліна пазірала на Крыгалевіча, якому — была ўпэўнена! — проста прыемна здзекавацца, зняважаць яе. Разумела чаму. Помніць, не даруе. Можа, і не пасадзілі б тады Ігара, калі б яна аддалася гэтай поскудзі!.. Ці ёсць што святое за душой у гэтага чалавека? Божа, Ігар вяртаецца! Яна не пісала яму паўгода. Не пісала... Каханне да Гены спапяліла ў яе душы ўсё тое, што было да таго, як яна выпадкова з ім пазнаёмілася на прыступках будынка міністэрства, дзе ён служыць, як закруціў-завярцеў лістапад яе думкі. Гэта быў страшэнны абвал, які скрышваў на сваім шляху ўсе перашкоды. Каханне запаланіла ўсю яе душу, яно было ў кожным куточку. Яна расцвіла зноў, адчула сябе чалавекам, жанчынай, якая хацела кахаць і быць каханай. Толькі два тыдні, як прайшло вяселле. Развод афармілі без Ігаравай згоды і папярэджання. І вось так нечакана яго адпусцілі... Хто толькі мог падумаць, што...

— А вы сталі іншай, Ліна Паўлаўна. Новы шлюб на вас добра ўздзейнічае. Але вось жа ашаломіце вы Лазіцкага. А добра ж жылі, пакуль...— Крыгалевіч смяяўся адкрыта ёй у твар.

Як цярпець гэты здзек? Іншым разам яна не стрывала б — пляснула б па твары. Зараз устрымалася. Старалася не хваляваца, не выдаць сваёй нянавісці. Але не змагла.

— Дзякуй, таварыш маёр, за віншаванне і камплімент. А ва ўсім астатнім разбяруся неяк сама. Грубае, але праўдзівае параўнанне: кожнай свінні — сваё карыта. Толькі не крыўдуйце, калі ласка. Мала што дурная маладзіца сказала. Але вось больш бы за сабой глядзелі... Можна ісці? — сказала гнеўна, з выклікам. Крыгалевіч толькі лыпаў вачыма — не чакаў такога. Яна павярнулася да дзвярэй, але перадумала — спыніцца не магла, каб не выказаць таго даўняга, што забіла ў душы ўсю веру ў справядлівасць. Рэзка адгарнула пасму валасоў, сутаргава задрыжэлі вусны.— Вы, Рыгор Ануфрыевіч, маглі тады выратаваць Ігара. Ён жа абараняў мой прафесійны гонар. Хай бы год далі. Толькі ж плата была непамернай. Гандляваць сабой, як гэта робяць іншыя тут, я не магла. Але трэба было ратаваць Ігара, бо ён абараняў мяне не як жонку ў значнай ступені, а як службоўцу. Вы ж загадалі прапісаць таго падонка, я не сумняваюся цяпер, што вы іх рукамі і дома мяне хацелі прыпалохаць. Паслухае, паддасца. Ды не тут жа было...

— Ну-ну, Ліна... Усё, закончылі гутарку. Хто старое ўспомніць... Я не хацеў вас пакрыўдзіць. Вы ж ведаеце, як я да вас адношуся...

Крыгалевіч — адкуль толькі ўзялася ў яго жвавасць — умомант апынуўся каля жанчыны, агарнуў яе атлусцелымі рукамі і пацалаваў. Ліна не паспела нават войкнуць. Апамятаўшыся, што было моцы адштурхнула Крыгалевіча, адступілася.

— Што вы сабе дазваляеце?..— Здавалася, усё, што трапіла б у гэты момант ёй пад руку, было б знішчана, вочы жанчыны свяціліся нянавісцю. І адначасова ёй было гідка ад яго нечаканага пацалунка.

— Ліначка, мажа, калі і скрыўдзіў, прабачце, яй-богу, не са зла, не са зла... Паверце. Люблю я вас... Што зробіш, даўно люблю. Толькі як ні стараўся падабрацца, спадабацца — ну ніяк не ўдалося. Вы як каменная нейкая... Паважаю такіх...

Ліна ніколі яшчэ не чула такога ласкавага тону ў голасе начальніка. Разгубілася, але ўмомант авалодала сабой.

— Не забывайцеся.— Голас хоць і цвёрда, але неяк спалохана прарваўся ў застылай цішы кабінета.

Раптам Крыгалевіч апынуўся ў яе нагах — начальнік абхапіў яе калені:

— Ліначка, золатца, што хочаш аддам. Хачу цябе, разумееш, адну цябе, каторы год. Нічога не магу з гэтым зрабіць. І рапарт аб пераводзе трымаў да апошняга. Даруй усё, чуеш, богам прашу...

«Божа, дай мне сілы забіць... Грэх ці два. Не, разарваць на кавалкі гэтае стварэнне, якое памылкова нехта надзяліў бязмежнай уладай, праз каго ўсё жыццё было перакрэслена, ушчэнт пазбаўлена сэнсу!»

— Адыдзі, поскудзь. Маньяк!..— Яна адштурхнула Крыгалевіча і з плачам выбегла з кабінета.

...Учора яна здала справы. Больш заставацца ў гарадку не магла. Падсвядома адчувала, што баіцца сустрэчы з Ігарам. Ігар захоча пабачыць Вітальку. Сустрэча адбудзецца, рана ці позна... Лепш потым, калі ўсё ўляжацца. Калі ўсё ў яе жыцці будзе стабільным.

Пакуль жа яна вырашала, што рабіць з кватэрай. Іх камунальная двухпакаёўка... У Мінску яе чакае ў два разы большая. Ці будзе яна там шчаслівая, як тут?..

* * *

— Ліна, салавей-разбойнік кліча. Зірні, хто там прыйшоў...— гукнуў з кухні Ігар.

Ліна якраз развесіла на балконе бялізну, папраўляла фіранкі на вокнах, паўз якія ціха ніколі не пройдзе Віталька, каб не паганяць па пакоі ветрык. Ігар разам з сынам майстраваў домік для птушак.

Яна не спыталася хто — дзверы адчыніла адразу.

Не паспела здзівіцца, як Аліеў адштурхнуў яе ўбок і апынуўся ў кватэры. За парогам яна ўбачыла яшчэ дваіх, чужых. Ніколі не сустракала іх у горадзе.

— Ну што, не чакала, гаспадыня? — Азербайджанец зірнуў нахабна на яе — бы распранаў. Жанчына зніякавела — стаяла, прыціснутая дзвярамі ў куце, і старалася зашпіліць гузік кароценькага халаціка.

Аліеў смела прайшоў у залу, агледзеў і вярнуўся, быццам успомніўшы пра далікатнасць:

— О, я прашу прабачэння, што так уварваўся. Без запрашэння, я маю на ўвазе. Але справу адкладваць нельга. Я спадзяюся, вы разумееце, чаго я прыйшоў. Усё-такі служба ёсць служба, а ў дамашняй абстаноўцы...— Ён ухмыльнуўся, і толькі зараз Ліна заўважыла, што ў руках нечаканага госця букет чырвоных руж.

— Гэта вам...— Ён працягнуў кветкі жанчыне.— Павінен сказаць, вы вельмі прыгожая, я зайздрошчу вашаму мужу. Можа, пройдзем у зал?

— Навошта вы тут?.. Што вам яшчэ трэба? Кветкі?.. Мне здалося, што вы разумны чалавек. Вы не маеце права на прапіску, нават на часовую. Калі не пакінеце мяне ў спакоі, я выклічу дзяжурную брыгаду. Лепш пакіньце кватэру па-добраму...— Ліну пачало трэсці. Не ведала: ці спалохалася, ці прастудзілася на балконе, бо нічога не накінула на плечы.

— Ну, навошта так? Мы — звычайныя людзі, зможам дамовіцца... Згаджуся, хоць не веру, што вам не падабаюцца кветкі. Я іх выкіну...

І ён сапраўды адчыніў дзверы і выкінуў кветкі на лесвічную пляцоўку. Ліна сцялася яшчэ больш.

Аліеў ледзь прыкметна самазадаволена ўхмыльнуўся:

— Няўжо вам не патрэбны грошы?

— Я паклічу мужа...— Ліна спрабавала выйсці з пасткі паміж вуглом і дзвярамі, але «госць» перакрыў дарогу.

— Пашкадуеш, сучка...

Ён прыціснуў яе да сцяны, дыхнуў перагарам і цыгарэтамі.

— Ліна, хто да нас? — азваўся, на шчасце, з кухні гаспадар, і праз хвіліну, не дачакаўшыся адказу жонкі, Ігар, высокі і збіты, у сваім звычайным спартыўным касцюме, які, прыйшоўшы сёння крыху раней са спартыўнай секцыі, яшчэ не паспеў пераапрануць, выйшаў у калідор.— Што здарылася, жонка? Чаму не адзываешся? І святло ўключыць забыліся...

Ігар націснуў на выключальнік — ярка ўспыхнула лямпачка. Здзівіўся, пабачыўшы, што за госць.

Аліеў ацаніў сітуацыю, адступіўся. Вочы забегалі па пакоі: відавочна, гутарыць з мужчынам не было ў яго планах. Мабыць, думаў, як ішоў сюды, што застане дома толькі гаспадыню.

— У чым справа? — Ігар запытаўся ў іх абаіх, зразумеўшы, што нешта не так, не спускаў вачэй з няпрошанага візіцёра.

— Ды справа не варта выедзенага яйка. Сітуацыя простая. Мне патрэбна часовая прапіска ў гэтым гарадку... Плачу пяцьсот баксаў. Начальнік міліцыі не супраць. Вы, гляджу, небагата жывяце...

Сведчанне гневу — кроў прыліла да твару мужа. Ліна ведала, што зараз можа здарыцца. Яна не магла больш трываць, імгненна апынулася каля дзвярэй і шырока расчыніла іх.

— Прэч адсюль!..

— Добра, я гляджу, што вы не з палахлівых, але ўсё ж...— Ён працягнуў іх Ігару — скручаныя ў цэлафан долары.— Вось вам грошы, лічыць не трэба...

Ігар кіпеў, але стараўся трымаць сябе ў руках.

— Мы людзі гасцінныя, але ж... Вось Бог, вось парог... І запомніце — не раю яе больш турбаваць.

— Як хочаце, я прапаноўваў па-харошаму...

На кухні гучна нешта бразнула, ровам азваўся Віталька — і Ліна, забыўшыся на ўсё, кінулася да сына.

Аліеву нічога не заставалася, як пакінуць кватэру, але з-за парога, рэзка павярнуўшыся, прапанаваў Ігару:

— А можа, вырашым гэтае пытанне? У прынцыпе, мы можам пагаварыць па-мужчынску, давай выйдзем, не будзем трывожыць тваю жонку і дзіця...

Ліна супакоіла малога, выйшла з ім на руках у прыхожую. Убачыўшы, што муж падаўся з кватэры, крыкнула:

— Ігар, не ідзі. Яны ўтрох. Я выклічу міліцыю...

— Навошта міліцыя? Мы проста пагаворым. Не турбуйся, гаспадыня...

Ігар — хіба ж яго спыніш — толькі падміргнуў: «Не хвалюйся, дурненькая. Я ўмомант... Ідзі, кладзі Вітальку спаць...» — і выйшаў, не апранаючыся, з кватэры, зачыніў за сабой дзверы.

Віталька зноў захныкаў — моцна-такі ўдарыў малатком па пальцы. Яна патрымала пальчык крыху пад халоднай вадой — дзіця супакоілася... Стаілася за дзвярамі. Пачуць, што там было, не магла — на лесвічнай пляцоўцы гуляў вецер, ды і баялася застудзіць дзіця. На душы ж нешта скрабло. Неўтаймавана білася сэрца. Хвіліны цягнуліся, здаліся вечнасцю.

Пакінуўшы малога ў спальні, яна выйшла на калідор і пачула валтузню. Кінулася туды з крыкам: «Гады, што вы робіце!»

Яе крык як быццам астудзіў азербайджанцаў, але не здолеў спыніць удар Ігара — Аліеў не ўтрымаўся на нагах, стукнуўся галавой аб прыступку, скаціўся ўніз па лесвіцы.

Вячэрнія візіцёры і Ігар, з брыва якога цякла кроў, на момант здранцвелі, пабачыўшы чорную лужыну крыві на пляцоўцы...

* * *

Яна нічога адгэтуль не хацела браць — кожная рэч, кожны куточак кватэры згадваў пра былое, згубленае, шчасце, пра Ігара... У гэты апошні вечар у яе ныла, тузала сэрца, Ліна не магла знайсці сабе месца. Успаміны зноў вярталі яе ў, здавалася б, адрынутае і забытае.

Вецер люта кідаўся ў акно, нагадваючы мелодыю расстання, моцна звінела шкло ад сыпучых крупінак снегу. Толькі два словы звінелі ў вушах: «Вяртаецца Ігар...» Толькі два словы. Не ўключаючы святло на кухні, Ліна глядзела на начны горад. Часам ёй здавалася, што моліцца-крыжуе ў забыцці: «Божа, якая я грэшніца, як я магла гэтак?..» Няпрошана, неадчэпна лезлі пытанні, і яна нічога не магла з гэтым зрабіць. І чым больш Ліна ўглядалася ў зімовую ноч, тым больш не знаходзіла адказаў на іх... «Так, вінаватая, але ж... пакахала. Так, як не кахала яшчэ ніколі, як не пакахае нікога больш. А можа, і не было яго, кахання, да Ігара?.. Ніхто не вінаваты, што гэтак у нас атрымалася... Ніхто? Не, можна з глузду з'ехаць!..»

Ліна падалася ў залу, уключыла тэлевізар, села ў крэсла.

Перадавалі навіны. Хацела хоць крышку зразумець, пра што гаворыць каментатар. Цэны, эканоміка, улада... Думкі зноў скіроўваліся да былога, як ні перасільвала сябе.

І да цягніка было рана.

Дамовілася з суседкай, што тая будзе наглядаць за кватэрай, аплачваць рахункі. Пакуль не вернецца Ігар...

Яму застаецца кватэра. У яе Гены ўсё ёсць. Віталька не захацеў нават з ёй застацца пасля вяселля. На гэты час, пакуль будзе аформлены яе пераезд, застаўся з Генам. Рады, што ў школу ходзіць у сталіцы. «Застаўся з бацькам?.. Ці будзе Гена гэтакі, як Ігар? Дзіця ж не яго, ды і Віталька не маленькі!..»

Адключыла тэлевізар, падалася ў спальню, але перадумала. Наварочваліся слёзы. Застыла ў прыхожай, углядаючыся ў шырокае — ці не на ўсю сцяну — люстра, ледзь стрымліваючы сябе, каб не заплакаць. Мінула, прайшло... Хопіць! Што здарылася, тое здарылася...

Крыху супакоіўшыся, пачала апранацца. Успамінала нядаўняе вяселле: радня Гены, дыпламаты, вялікія людзі... Адно пластавалася на другое: царква, шыкоўны рэстаран, воклічы «Горка!», яе вясельная сукенка — Генка ледзь не сілком прымусіў апрануць белую шлюбную сукенку. Ён жа жаніўся ўпершыню...

Не вытрымала — усхліпнула. Каб не раскіснуць зусім, хуценька падалася да дзвярэй. Раптам нешта ўспомніла, дастала з сумачкі пярсцёнак. Прайшла ў залу і паклала на журнальны столік. Падалася да дзвярэй, поўнымі слёз вачыма акінула кватэру, патушыла святло...

Цягнік меўся быць яшчэ амаль хвілін праз дзесяць. Касірка ведала яе ў твар, не здзівілася, але з сумам — у горадзе ўсё вядома, не схаваеш — уздыхнула, пажадала:

— Хай жа вам дасць Божачка дабра толькі, Ліначка...

Ліна апусціла вочы, не змагла адказаць. Узяўшы білет і агледзеўшы пустую залу чакання, выйшла з памяшкання.

Не спыняўся, студзіў думкі вецер, прадуваў наскрозь паліто. І ёй ад гэтага было лепш.

— На вясну верне, перабірае, бач ты...— сказаў да яе нейкі дзядок, што па-старэчы згорблена прытуліўся да вакзальных дзвярэй, чакаючы цягніка.

— Відаць, так...— адказала Ліна, але, не ахвочая да размовы, падалася далей, на перон. Раптам усяго ёй стала шкада. Здавалася, быццам гарадок пакрыўдзіўся на яе, і таму яна бяжыць, уцякае ад яго невядома куды.

Ледзь заўважна праплыў цягнік, мільгалі нумары вагонаў. Там было цёмна, людзі спалі. Вось і яе, другі, вагон, а месца...

Маладзенькая праваднiца прыдзірліва ўглядалася ў білет.

— Другое месца. Не затрымлівайце. Стаім дзве мінуты.

«Божа, наканаванасць, нейкае насланнё — мяне чакае другое, зусім іншае жыццё. Ці гатова я да яго?!»

Яна затрымалася ў тамбуры, папрасілася:

— Я тут трошачкі пастаю.

— Няма чаго стаяць, ёсць білет — займайце месца...— Праваднiца раптам асеклася, убачыўшы слёзы на вачах пасажыркі.— Што з вамі? Супакойцеся...

— Нічога, гэта так... Вы ідзіце, я зачыню за сабой...

«Вось і ўсё... Што ж, можа, гэта і лепш...» Хусцінкай выцерла слёзы.

Зірнула апошні раз на прывакзальную плошчу і раптам няўцямна, як міжволі, крыкнула некуды ў цемень:

— Іга-а-р...

Цягнік рушыў, постаць мужа — былога — аддалялася ўсё далей і далей. У яе перахапіла дыханне — яна не магла больш крычаць, яна не магла сысці, яна не магла...

*1994*